# ДЫЯЛЕКТЫКА БЕСПЕРАПЫННАГА І ДЫСКРЭТНАГА Ў РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

***А. І. Бабко,***
*кадыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Праблема ўзаемадачыненняў бесперапыннага і дыскрэтнага пачаткаў рэчаіснасці глыбока і вынікова вывучалася і на ўзроўні філасофскай думкі, і ў сферы навуковага пазнання. Што да філасофіі, дык у гэтым плане неабходна вылучыць дыялектычную традыцыю, якая набыла класічную форму ў гегелеўскай сістэме. Гегель пераканальна паказаў, што згаданыя моманты ўтвараюць непарыўнае адзінства, а таксама выявіў характар і механізмы яго здзяйснення. У «Навуцы логікі» адпаведная праблематыка разглядаецца ў кантэксце дыялектычнага руху на ўзроўні катэгорыі колькасці. Бесперапынная і дыскрэтная велічыні выступаюць, на думку філосафа, як дзве формы ўвасаблення колькаснага аспекту рэчаіснасці. Надзвычай важна, што колькасць выступае ў абедзвюх гэтых формах як цэлае, бо кожная з іх змяшчае (у падпарадкаваным, ідэальным выглядзе) сваю супрацьлегласць [2, с. 193–195].

У галіне навуковага пазнання праблема ўзаемадачыненняў бесперапыннага і дыскрэтнага набыла асабліва востры характар у працэсе распрацоўкі квантавай механікі. Справа ў тым, што ў яго рамках спаборнічалі два тэарэтычныя праекты, кожны з якіх акцэнтаваў пэўны з бакоў адзначанай супрацьлегласці. Надзвычай важна, што прадказанні адносна вынікаў назіранняў і эксперыментаў, зробленыя на аснове абедзвюх тэорый, супадалі: гэта яскрава засведчыла іх унутраную тоеснасць [3, с. 19]. Нельга не адзначыць таксама, што ідэя грунтоўнага адзінства бесперапынных (хвалевых) і дыскрэтных (карпускулярных) характарыстык матэрыі адпаведна выявілася і ў знакамітым раўнанні Л. дэ Бройля.

У абагульнена-метафарычным сэнсе паняцці дыскрэтнага і бесперапыннага могуць плённа ўжывацца і пры вывучэнні культурных з'яў і працэсаў. Гэта фактычна мае месца ва ўсіх тых выпадках, калі філосафы або навукоўцы робяць прадметам сваіх пошукаў апошнюю, элементарную, базісную адзінку ана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізу культурнай рэчаіснасці (у якасці такой адзінкі – магчыма, яе правамерна было б назваць «культуратамам» ці «культурэмай» – выступаюць, напрыклад, учынак, сімвал, каштоўнасць, норма і г. д.). Бесперапынны пачатак у гэтым кантэксце задаецца агульным – рухомым, зменлівым, стваральным – полем культуры.

Згаданыя паняцці могуць быць эфектыўна задзейнічаны і пры вырашэнні праблем, датычных суадносін адзінства і разнастайнасці культуратворчай дзейнасці, а таксама неад'емна ўласцівых ёй пераемнасці і інавацыйнасці. Дадзеная магчымасць абумоўлена тым, што ўяўленні, у якіх фіксуюцца адзначаныя вышэй супрацьлеглыя бакі культуратворчасці, істотным чынам звязаны з такімі феноменамі, як культурная прастора і культурна-гістарычны час, бесперапынныя і дыскрэтныя характарыстыкі якіх яны якраз і адлюстроўваюць.

Як і ў сферы прыродазнаўства, у філасофскіх і навуковых даследаваннях культуры найбольш слушнай і плённай падаецца дыялектычная стратэгія распрацоўкі адпаведнай тэматыкі: у кантэксце культурнай прасторы тоеснасць павінна разглядацца ў глыбокай узаемасувязі з рознасцю і разнастайнасцю, а пераемнасць у кантэксце культурна-гістарычнага часу – з інавацыйнасцю і зменлівасцю. Характар гэтай узаемасувязі заўжды канкрэтны і павінен вызначацца на аснове ўважлівага аналізу пэўных культурных рэалій. Сапраўды, культура можа быць больш ці менш гамагеннай (гетэрагеннай) і больш ці менш традыцыйнай (дынамічнай). У нарматыўным плане – з пункту гледжання ідэальнай мадэлі ўзаемадачыненняў згаданых момантаў – неабходна імкнуцца да іх арганічнага спалучэння.

Выдатныя дзеячы беларускай культуры глыбока ўсведамлялі гэтую неабходнасць і ставілі адпаведную задачу перад сабой і перад беларускім народам. Так, І. Абдзіраловіч, выяўляючы сутнасць усходняй і заходняй культур, указваў на іх (непрымальную для нас) аднабаковасць у кантэксце суадносін тоеснаці і разнастайнасці ў іх структуры [1, с. 12–14]. Разам з тым апафеоз інавацыйнасці, творчасці, які так урачыста і ўзнёсла гучыць у яго бессмяротным эсэ, прысвечаным існасці «беларускага светагляду», ён спалучае з пошукам найглыбейшага, найбольш аўтэнтычнага, першапачатковага падмурку для разгортвання адметных, непаўторных культуратворчых працэсаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у беларускай духоўнай прасторы (засяроджваючы пры гэтым увагу на паганстве).

Аднак ці была вырашана задача дыялектычнага сінтэзу бесперапыннага і дыскрэтнага пачаткаў у развіцці беларускай культуры? Каб атрымаць абгрунтаваны адказ на дадзенае пытанне, неабходна ўлічыць прысутнасць надзвычай моцнага трагічнага складніка ў гістарычным развіцці беларускага народа (як гэта робіць І. Абдзіраловіч [1, с. 8]). На сваім шляху беларусы сутыкаліся з перашкодамі, пераадоленне якіх патрабавала надзвычайных намаганняў, каласальнай энергіі і ў пэўных аспектах не завяршылася яшчэ і ў сучасных умовах. Таму на сённяшні дзень згаданая задача вырашана настолькі, наколькі магчыма.

Усведамленне сваёй (найперш ментальнай) адметнасці і звязанае з ім памкненне захаваць і ўмацаваць дзяржаўную незалежнасць аб'ядноўвае на дадзены момант большасць беларусаў і выяўляе тоесны пачатак у нашай культуры. Аднак ён не здолеў развіцца настолькі моцна і выразна, каб прасякнуць сабой усе разнастайныя праявы культурнага жыцця, што назіраюцца ў нашым грамадстве. Самым відавочным чынам дадзеная тэза пацвярджаецца станам спраў, што мае месца ў моўнай сферы. Білінгвістычны (ці нават полілінгвістычны) характар нашай культурнай прасторы павінен быць ацэнены станоўча, бо ў ім выяўляецца неад'емны для паспяховага развіцця культуры момант разнастайнасці. Разам з тым, аднак, нацыянальная мова зусім не дамінуе ў беларускім грамадстве. Калі культура здзяйсняецца найперш у мове і праз мову, дык той факт, што ў беларускай культурнай прасторы пераважнае становішча мае мова іншага народа, сведчыць пра неадпаведнасць культурнай рэальнасці сваёй унутранай існасці. З пункту гледжання культурна-гістарычнага часу дадзеная сітуацыя ўказвае на небяспечную дысфункцыю трансляцыйных органаў нашай культуры (у канчатковым выніку мове належыць цэнтральнае месца ў іх сістэме). Таму яе нельга разглядаць інакш як прыкрую і непрымальную. Акрамя ўсяго іншага, пагадзіцца з ёй (нават у тым выпадку, калі бачыць у мове толькі сродак зносін і не болей) азначала б легітымізаваць і скарыцца той гістарычнай несправядлівасці, што была ўчынена ў адносінах да беларускага народа. З несправядлівасцю, аднак, неабходна змагацца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Наяўнасць дысгармоніі ва ўзаемадачыненнях бесперапыннага і дыскрэтнага пачаткаў у развіцці нашай культуры, уласцівы ім момант супярэчлівасці і неадпаведнасці выяўляюцца, безумоўна, не толькі ў моўнай праблеме. Яна мае, аднак, найважнейшае значэнне ў гэтым плане (у ёй факусуюцца ўсе іншыя цяжкасці, складанасці і супярэчнасці). Таму найперш на яе вырашэнне павінны быць скіраваны намаганні ўсіх, каму неабыякавы лёс беларускай культуры. Пры гэтым надзвычай важна мець на ўвазе, што шляхі і метады згаданага вырашэння не павінны супярэчыць высокім духоўным ідэалам і нормам: усякія формы гвалту і прымусу з'яўляюцца тут недапушчальнымі. Моўны выбар – справа няпростая, нярэдка звязаная з тонкімі душэўнымі перажываннямі, і неасцярожнае ўмяшанне ў яго можа прынесці вялікую шкоду.

Найбольш дзейснай і найбольш прыгожай альтэрнатывай прымусовым сродкам умацавання пазіцый роднай мовы ў нашым грамадстве з'яўляецца стварэнне першакласнага, у найвышэйшай ступені прыцягальнага беларускамоўнага культурнага асяроддзя, багатага на глыбокія ідэі, арыгінальныя знаходкі, сапраўдныя шэдэўры. Таму кожны, хто жыве і працуе ў сферы беларускай мовы, павінен штохвілінна рабіць крок наперад, пераўзыходзіць і пераадольваць сябе дзеля таго, каб наблізіць дасягненне гэтай высокай мэты, каб новае пакаленне дзеячоў беларускай культуры мела ўсё больш трывалы і надзейны падмурак для ўсё больш творчай і плённай працы.

Такім чынам, дыялектычная стратэгія аналізу і вырашэння праблемы ўзаемадачыненняў бесперапыннага і дыскрэтнага пачаткаў у развіцці культуры нацэльвае беларускі народ на іх арганічны сінтэз, які можа быць дасягнуты найперш праз інтэнсіўную творчую дзейнасць. Дыялектыка выступае ў гэтым плане як дастаткова патрабавальная метадалогія. Аднак толькі патрабавальнасць да сябе можа забяспечыць сапраўднае і годнае быццё ў свеце. Гэта мае моц і адносна індывідуальнага жыцця, і адносна жыцця народа. Абраць самога сябе – сваю мову, сваю веру, сваю культуру – сапраўды няпроста, але іншага шляху да самаздзяйснення і самасцвярджэння не існуе.

1. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Hegel, G. W. F.* Wissenschaft der Logik : in 2 Teilen / G. W. F. Hegel. – Berlin : Akademie-Verlag, 1975. – T. 1. – 401 S.
3. *Schrödinger, E.* Was ist ein Naturgesetz? Beiträge zum naturwissenschaftlichen Weltbild / E. Schrödinger. – München, Wien : R. Oldenbourg, 1962. – 148 S.

## НОВАЦИЯ КУЛЬТУРЫ В КОНЦЕПЦИИ РАЗВИТИЯ СОВРЕМЕННОГО КИТАЯ

***Ван Юй,***
*соискатель, Белорусский государственный университет культуры и искусств*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В последние десятилетия ни одно из современных государств не привлекает к себе столь пристального внимания, как Китай. Страна, которая долгое время считалась отсталой, совершила на рубеже XX–XXI вв. стремительный рывок, оставив далеко позади многие развитые страны мира. Открыв себя миру в конце 70-х гг. XX в., Китай достаточно быстро оказался в центре геополитических и торгово-экономических интересов крупнейших стран мира, которые устремили свой взор в сторону Поднебесной. Либерализация экономики, привлечение в страну колоссальных зарубежных инвестиций, диверсификация рынков, стремительный рост темпов экономики довольно быстро превратили Китай в экономически развитое государство со своей национальной спецификой. Успехи Китая огромны, касаются всех сфер общественной жизни и признаются всем мировым сообществом.

Культура каждой эпохи исторического развития страны имеет свои приметы и особенные черты. В собственно китайской историографической традиции, окончательно сложившейся уже во II–I вв. до н. э., культурно-исторический национальный процесс структурируется исходя из династийных периодов. Каждая династия имеет собственное название, отличное от фамилии правящего семейства, под которым она и фигурирует в оригинальной историографической периодизации. В качестве таких названий вначале использовались этнонимы (названия народностей, основавших, по преданию, данное государство) и топонимы (названия удельных владений основате-